738(476)
А.А.Трусаў
г. Мінск

# Гродзенская кафля з палаца Стэфана Баторыя

У 80-я гады XVI ст. былы замак Вітаўта ў Гродне, які з'яуляўся адной з каралеўскіх рэзідэнцый, быў цалкам перабудаваны паводле загаду караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя. Перабудова пад кіраўніцтвам італьянскіх спецыялістаў вялася ў рэнесансным стылі. Галоўнай часткай замка, адбудаванага на падмурках замка Вітаўта, стаў каралеўскі палац. Археалагічныя раскопкі паказалі, што перад будаўніцтвам палаца Стэфана Баторыя тэрыторыя замка была грунтоўна расчышчана. На першым паверсе палаца былі памяшканні, што выкарыстоўваліся для вайсковых і гаспадарчых патрэбаў. Каралеўскія пакоі знаходзіліся на другім паверсе і мелі шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя зялёнай (паліванай) ці шматколернай (паліхромнай) кафляй.

У часы руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. замак моцна пацярпеў і быў спалены. Слаі яго разбурэння і пажару зафіксаваны намі ў многіх раскопах. Сярод шматлікіх знаходак у гэтым пласце знойдзена шмат кафлі з каралеўскага палаца.

Упершыню кафляныя печы ў пабудовах на тэрыторыі Старога замка згадваюцца ў «Пісцовай кнізе Гродзенскай эканоміі», якая была складзена ў XVI–XVII стст. Гэтая вельмі цікавая пісьмовая крыніца ўтрымлівае звесткі аб наяўнасці ў тагачасным замку больш трох дзясяткаў кафляных печаў. Ёсць згадкі аб зялёнай паліванай кафлі, таксама называюцца «печы белыя», альбо «печы кафлі белай». Паколькі кафлі, пакрытыя белай палівай, у значнай колькасці з'яўляюцца толькі ў XVIII–XIX стст., гаворка, відаць, ідзе аб печах са звычайнай тэракотавай кафлі, якая потым была пабелена. Дарэчы, непаліваныя кафлі са слядамі пабелкі неаднойчы сустракаліся нам падчас раскопак у розных гарадах Беларусі. Цікава адзначыць, што ў адным з будынкаў замкавага палаца знаходзілася печ «віленскай работы». Мяркуючы па назве, можна выказаць думку, што яна была аблямавана дарагой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паліхромнай рэльефнай кафляй, зробленай па спецыяльным заказе віленскімі майстрамі. Таму не выпадкова, што некаторыя віды паліхромных кафляў, знойдзеных намі побач з палацам Стэфана Баторыя, не маюць аналогій у нашых беларускіх гарадах і замках [1].

Але ў Польшчы пэўныя аналагі нашай кафлі ёсць. У гора-дзе Гданьск побач з гарадской ратушай захаваўся сярэднявечны будынак, які атрымаў назву Двор Артуса. Росквіт Гданьска прыпадае на XVI і першую палову XVII ст. У гэты час у Гданьску працавалі французскія майстры і мастакі, якія ўнеслі свой важкі ўнёсак у аздабленне інтэр'ераў Двара Артуса. Адзін з іх – Штэльц-нер – у 1545–1546 гг. пабудаваў велізарную кафляную печ вышынёй 12 метраў і аздобіў яе кафляй з партрэтнымі выявамі заможных жыхароў горада ў багатай вопратцы. Гэтая печ ніколі не палілася, заўжды была халоднай і мела функцыю шыкоўнай аздобы. Цікава, што кафля, зробленая ў Гданьску паводле галандскіх узораў, прадавалася на ўсёй тэрыторыі Польшчы. Мець у доме так званую «гданьскую печку» было вельмі прэстыжна [2]. У Беларусі падобныя печы называліся «віленскімі».

Шмат кафлі было знойдзена польскімі даследчыкамі ў 30-я гады XX ст., а таксама М. Варонiным у 1949 г. Аднак польскія навукоўцы зусім не пісалі пра свае знаходкі, а М. Варонін надрукаваў толькі адзін фотаздымак фрагментаў гаршковай кафлі, якую знайшоў у яме пад Верхняй царквой. Даследчык, не ведаючы, што гэта такое, тым не менш адзначыў добрую якасць вырабу невядомых яму начынняў. У яго манаграфіі ёсць таксама згадкі аб «рэльефнай зялёнай кафлі з усходняга раскопу».

На шчасце, не ўвесь кафляны матэрыял з раскопак Ю. Ядкоўскага, З. Дурчэўскага і М. Вароніна загінуў. Частка яго апынулася ў музейных фондах і нават трапіла ў экспазіцыю. Экспазіцыйны матэрыял і быў часткова надрукаваны ў Кароткай энцыклапедыі БССР, а таксама ў буклеце Р.Валадзько і кнізе М. Кацара [3]. Аднак датаванне гэтых кафляў яўна памылковае. Больш дакладнае іх датаванне пададзена намі ў альбоме «Беларуская кафля» [4].

Асноўная калекцыя кафлі падчас раскопак на тэрыторыі Старога замка ў Гродне была сабрана намі ў 1985–1988 гг.: 657 кавалкаў гаршковай кафлі і 2620 фрагментаў каробкавай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Росквіт кафлянай вытворчасці ў Гродне прыпадае на другую палову XVI–XVII ст. Сярод знаходак вылучаецца кафля ад розных частак кафляных печаў: сцянная, кутняя, гзымсавая, паясковая і каронкі. Найбольш пашыраная зялёнапаліваная і паліхромная кафля. Непаліваных экзэмпляраў было знойдзена няшмат. На падставе сабраных матэрыялаў мы змаглі зрабіць некалькі рэканструкцый кафляных печаў гэтага часу [5].

Да другой паловы XVI ст. адносіцца зялёная паліваная кафля, вонкавая пласціна якой мае значны выгін і аздоблена малюнкам у выглядзе вялікага квадрата, у цэнтр якога ўпісаны меншы квадрат. Кафля такога тыпу знойдзена намі ў Лідскім замку. Адначасова ў будынку Старога замка ўжывалася кафля з квадратнай вонкавай пласцінай і высокімі борцікамі. Арнамент у выглядзе розных варыянтаў шматпялёсткавай разеткі выконваўся ў тэхніцы паглыбленага рэльефу.

Самай цікавай з усёй калекцыі з'яўляецца паліхромная кафля канца XVI ст., упрыгожаная разнастайнымі тыпамі арнаменту. Магчыма, да адной з печаў XVI ст. мы маем цэлы пячны набор розных па канструкцыі кафляў. Гэтая печ хутчэй за ўсё некалі аздабляла палац Стэфана Баторыя.

На наш погляд, адной з самых унікальных знаходак з'яўляюцца фрагменты квадратнай кафлі канца XVI ст. Цэнтр яе займае профільная выява чалавека ў лаўровым вянку, заключаная ў двайную круглую рамку, унутраны край якой заканчваецца шэрагам аднолькавых петляў. У ніжніх кутах кафлі знаходзяцца выявы двухгаловых арлоў, у верхніх – ільвоў з пышнымі грывамі і доўгімі хвастамі, паміж імі змешчана карона як сімвал каралеўскай улады. Спалучэнне белага рэльефу з сінім колерам фону дае непераўзыдзены эфект і аказвае моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. Памеры кафлі – 19 х 19 см, вонкавая пласціна даволі тонкая. У калекцыі маецца цэнтральная частка кафлі такога ж тыпу, але профільная выява караля павернута ў другі бок. Па характары малюнка бачна, што драўляныя формы рабіліся хутчэй за ўсё рознымі майстрамі. Трэба адзначыць, што аналагаў такой кафлі пакуль не знойдзена на тэрыторыі Беларусі.

Вельмі рэдкай знаходкай з'яўляецца і фрагмент паясковай кафлі, які мы ўмоўна назвалі «пасвячэнне ў рыцары». На ёй –



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выявы двух чалавек у тыпова рэнесансавым адзенні, адзін з іх стаіць тварам да нас, другі прыпаў на адно калена, у руках трымае корд альбо меч. Тонкая прапрацоўка дэталей адзення, твараў, прычосак, атрыбутаў, рэалістычны малюнак з добрым веданнем прапорцый чалавека – усё гэта, безумоўна, сведчыць аб высокім прафесійным узроўні майстра, які, відаць, быў немясцовага паходжання і запрошаны ў Гродна для выканання спецыяльнага заказу. Вышыня кафлі – 11,5 см, рэльеф высокі, таксама белага колеру на сінім фоне, які амаль не захаваўся, бо паліва адлушчылася з-за дрэннага счаплення з чарапком. Вонкавая пласціна мае сляды неаднаразовай пабелкі.

Прыцягвае ўвагу і невялікі кавалак кафлі з выявай барабаншчыка. На жаль, верхняя частка тулава сколата, засталася толькі частка галаўнога ўбору, а вось барабан захаваўся цалкам. Кафля гэтая таксама паліхромная: спалучэнне сіняга і белага колераў.

Акрамя таго, у калекцыі ёсць пояскавая кафля анімалістычнага характару з сіметрычнай кампазіцыяй: на адной з іх выява каня (кафля двух тыпаў – непаліваная і паліхромная), на другой – леў (?) з загнутым угору хвастом і птушка; у цэнтры быў нейкі герб, але захаваўся толькі невялічкі яго кавалак з крыжам.

У паўночнай частцы Замкавай гары ў час расчыстак памяшканняў казематаў XVI–XVII стст. было знойдзена 18 кавалкаў паліхромнай кафлі, вонкавая пласцінка якой аздоблена выявай букета ў вазоне. Складаная па форме кветка з выгнутымі лісткамі знаходзіцца ў прыгожай белай вазе з высокай шыяй і выгнутымі ў выглядзе лацінскай літары S ручкамі. Па краях вонкавай пласціны праходзіць высокая рамка шырынёй 1 см. Сама пласціна таўшчынёй 1,1–2 см мае форму, блізкую да квадрата (19 x 19,5 см). Квадратная румпа вышынёй 9 см мацавалася з дапамогай жгуціка сырой гліны, прыціснутага пальцамі, але не загладжанага. У дэкаратыўным аздабленні кафлі побач з глухімі палівамі – сіняй (фон) і белай (ваза) – ужыта зялёная свінцовая глазура (кветка, лісты і рамка).

Падобная кафля, але зялёная ці тэракотавая, знойдзена ў Лагойску, Лідскім, Крэўскім і Мірскім замках [6].

Да гэтага ж часу адносіцца зялёнапаліваная партрэтная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кафля, вонкавая пласціна якой мае памеры 19,5 х 18,5 см. На ёй у двухпрыступкавай рамцы маецца малюнак чалавека ў профіль, які трымае ў руках рэчы, падобныя да атрыбутаў каралеўскай альбо імператарскай улады (дзяржава і скіпетр). Такая кафля, толькі непаліваная, знойдзена ў Мінску.

Канцом XVI ст. датуюцца і паліхромныя кафлі з раслінным арнаментам, якія маюць шырокую падвоеную рамку, тыповую для гэтага часу, жоўтага і бірузовага колераў, белы рэльеф на сінім фоне. Пазнейшым з'яўляецца фрагмент паліхромнай кафлі з малюнкам расліннага характару (чатырохчленнай сіметрыі), рамка робіцца вузейшай і меншай вышыні, малюнак набывае рысы, уласцівыя для эпохі барока, колеравае вырашэнне тое ж самае.

Таксама знойдзена гзымсавая кафля з выявай маскарона канца XVI ст. двух тыпаў – паліхромная (белы рэльеф на сінім фоне) і зялёнапяліваная.

Каронкі прадстаўлены некалькімі фрагментамі з раслінным арнаментам у спалучэнні з геаметрычным, вонкавая паверхня іх увагнутая.

У канцы XVI – першай чвэрці XVII ст. сярод дэкору гродзенскай кафлі найбольш пашыраны раслінны арнамент. Даволі часта ён будаваўся па прынцыпу чатырохчасткавай сіметрыі: у цэнтры вонкавай пласціны размешчана разетка, ад якой у куты пласціны цягнуцца стылізаваныя сцяблiны. Іншыя тыпы арнаменту – гэта розныя сцяблiны, кветкі, лісце аканта. Таксама знойдзена некалькі гзымсавых і сцянных кафляў з геаметрычным арнаментам у выглядзе ромбаў альбо чатырох невялікіх квадратаў. Адной з найбольш цікавых з'яўляецца гзымсавая кафля, у цэнтры якой змешчана стылізаваная валошка; яна мела два колеравыя вырашэнні: зялёнапаліванае і паліхромнае.

Адначасова з будаўніцтвам палаца Стэфана Баторыя перабудоўвае Мірскі замак Радзівіл Сіротка, таму печы ў пакоях Радзівілаў з'явіліся адначасова з гродзенскімі.

Пісьмовыя крыніцы XVII ст. сведчаць пра багатае ўбранне Мірскага палаца, які ацяплялі шыкоўныя печы, зробленыя з паліхромнай кафлі. У час шведскіх нападаў (1655 і 1706 гг.) палац шмат разоў гарэў і разбураўся. Таму ў другой палове XVII – пачатку XVIII ст. старыя печы паступова разабралі і зрабілі новыя з

зялёнай паліванай кафлі [7].

Асноўная частка ўсіх кафлін датуецца канцом XVI – першай паловай XVII ст. – часам найбольшага росквіту Мірскага замка. Прычым час бытавання некаторых з іх можна дакладна вызначыць па датах, якія на іх маюцца. Так, напрыклад, у калекцыі ёсць датаваная 1583 г. кафля-каронка. Яна знойдзена побач з паўночнай сцяной замкавага корпуса разам з двухзубым відэльцам, белагліняной люлькай галандскага тыпу (ранняга) і шэрагам рэчаў канца XVI – першай паловы XVII ст. Гэта сведчыць аб тым, што на той час паўночны корпус палаца, які пабудавалі Радзівілы, ужо дзейнічаў.

Усю калекцыю кафлі можна падзяліць на тры вялікія групы: непаліваная, зялёнапаліваная, паліхромная. З іх найбольшую цікавасць уяўляюць паліхромныя кафлі. Першыя паліхромныя печы зроблены падчас будаўніцтва замкавага палаца ў канцы XVI ст. Матэрыялы даследавання паказваюць, што ў замку ўжо тады існавала вялікая колькасць печаў розных памераў і прызначэння: вялікія і малыя, цыліндрычныя, выступаючыя ў памяшканне і прыціснутыя да сцяны, кутнія ці пастаўленыя пасярэдзіне, поўнасцю размешчаныя ў пакоі і тыя, што часткова выходзілі ў другое памяшканне. Тут былі печы кухонныя і ацяпляльныя, складзеныя з кафлі тэракотавай, паліванай зялёнай глазурай, паліхромнай. Простыя печы, найболын танныя, з цэглы і тэракотавай кафлі будаваліся ў службовых памяшканнях, сутарэннях і на першым паверсе. Печы з зялёнай паліванай кафлі, відаць, былі прызначаны для святліц на другім паверсе. Печы з шыкоўных паліхромных кафляў ацяплялі толькі пакоі ўладароў замка на другім і трэцім паверхах.

Уявіць, як выглядалі пакоі з паліхромнымі печамі, можна, калі мы звернемся да апісання памяшкання таго часу з інвентара маёнтка Смаргоні, які належаў брэсцкаму ваяводзе Хрыстафору Зяновічу, а пазней перайшоў ва ўладанне Радзівілаў [8]. У інвентары за 1621 г. мы чытаем апісанне дзвярэй, акон і мэблі ў святліцы. Каля кафлянай печкі былі два тапчаны і зэдлік на аднаго чалавека. Сцены пакоя былі абцягнуты чорным сукном, на іх віселі пяць партрэтаў, з якіх тры – уладальнікаў маёнтка



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і два – каралеўскія. У вялікай сталовай ужо іншае аздабленне: дзверы і касякі размаляваны фарбамі, балкон з балясамі, буфет сталярнай работы, дзевяць акон з гербамі, сем сталоў сталярнай работы, пяць зэдляў простых і абцягнутых чорным сукном. Уздоўж сцен – лавы, столь размалявана рознымі фарбамі. Пасярод пакоя знаходзіліся два пазалочаныя падсвечнікі з дзвюма меднымі трубкамі для свечак. Другі падсвечнік – з ласінымі рагамі і галавой дракона наверсе. Падвешаны яны на пабеленых ланцугах. Печка з комінам і з рознакаляровымі кафлямі, на якіх выяўлены гербы яго міласці. Увесь пакой, а таксама лавы абцягнуты чорным сукном. Насупраць гэтага пакоя – другая святліца, двое дзвярэй якой маюць інкрустацыю з чорнага дрэва...

Адным словам, мы бачым, што гэта самыя раскошныя пакоі, у якіх дзверы, вокны, мэбля, асвятленне, нарэшце, печы – як правіла, дарагія, зробленыя з густам, па-мастацку. Абцягнутыя чорным сукном сцены, дзверы з чорнага дрэва і нават мэбля падкрэсліваюць шматколеравы роспіс столі і каляровае шматгалоссе кафляных печак. Па сутнасці, печка становіцца галоўным кампазіцыйным цэнтрам прасторы пакоя не толькі па паліхроміі, вертыкалі і памерах, але і па змесце, што нясуць рэльефы каляровых кафляў.

Аб паліхромных печах Мірскага замка, іх знешнім выглядзе, агульных памерах, тэматыцы выяўленчых матываў, іх мастацкім уздзеянні на прасторавае асяроддзе пакоя не дакладна, але ўсё ж можна меркаваць па кафлях, выяўленых у час археалагічных раскопак. Усяго знойдзена восем тыпаў паліхромнай кафлі з рознымі іх варыянтамі. Кожнаму тыпу адпавядае характар дэкору, які ад месцазнаходжання ў люстэрку печы надаваў патрэбную трактоўку агульнаму сюжэту.

Найбольшую колькасць сярод знойдзеных тыпаў складаюць «сценныя» квадратныя кафлі з бокам 20 см і ганчарнай румпай даўжынёй каля 7–9,5 см. Дэкор на іх двух відаў – раслінны і геральдычны.

Па выніках нашых раскопак зараз у Мірскім замку зроблены рэканструкцыі кафляных печаў канца XVI – пачатку XVII ст. Гэты вопыт неабходна скарыстаць пры аднаўленні

печаў у гродзенскім палацы Стэфана Баторыя.

## Літаратура

1. Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями издания Виленской комиссии для разбора древних актов. – Вильно, 1882. – С. 18.

2. Хрусьцинский, Ч. Изразцовые портреты // Польша, № 12. – 1980. – С. 40–41.

3. Белорусская ССР. Краткая энциклопедия. Т. 4. – Минск., 1981. – С. 187; Володько Р.Ф. Белорусские изразцы. Минск., 1987; Кацер М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии. Минск., 1972. С. 52–53.

4. Трусаў, А.А. Беларуская кафля. – Мн., 1989. – С. 44, 77, 79.

5. Трусаў, А.А. Стары замак у Гродне XI–XVIII стст.: Гіст.-археал. нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Минск.: Навука і тэхніка, 1993. – Мал. 84–87.

6. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. – Минск., 1988. – С. 143.

7. Иодковский, И.И. Замок в Мире // Древности. Труды комиссии по сохранению древних памятников. Т. 6. – М., 1915. – С. 70.

8. Инвентари магнатских владений Белоруссии XVII–XVIII вв.: Владение Сморгонь. – Минск., 1977. – С. 24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ